Іван Саверчанка



... раскажам пра пакуты і сьмерць яго, каб маглі пра іх ведаць тыя, хто прагне ведаць сёньня або потым...

# Каб і праз вякі не забыліся...

***Першая беларуская экзістэнцыяльная аповесьць***

*Прадмова і пераклад са старабеларускай Івана САВЕРЧАНКІ.*

Ананімная "Аповесьць пра пакуты і сьмерць Афанасія Філіповіча" – адзін з найбольш яркіх мастацкіх твораў першай паловы XVII стагоддзя. Напісаны ён берасьцейскім манахам, імя якога, на жаль, не ўстаноўленае. На тытуле невядомы аўтар вызначыў жанравую прыналежнасьць твору, назваўшы яго "аповесьцю".

"Аповесьць пра пакуты і сьмерць Афанасія Філіповіча" мае разгорнутую кампазіцыйную будову. Яна ўключае 10 асноўных кампанентаў, сярод якіх умоўна вылучаюцца: уступ-зачын, гістарычная даведка-напамін, сцэны літургіі, допыту, у вязьніцы, у абозе, катаваньня і забойства, стыхіі, адшуканьня цела і перазахаваньня закатаванага. Ва ўступе аўтар канкрэтызаваў творчую задуму: занатаваць апошні перыяд жыцьця Афанасія Філіповіча, паказаць яго цяжкія пакуты і сьмерць, каб і праз вякі людзі не забыліся пра зьверствы і зьдзекі са сьвятара. У гістарычнай даведцы пісьменьнік спыніўся на старонках біяграфіі Афанасія Філіповіча. Тут жа ён

канстатаваў перасьледы праваслаўных вернікаў з боку іншаверцаў.

Вельмі каларытна намаляваная сцэна літургіі. Асноўны акцэнт зроблены на зьяўленьні ў бажніцы прачыстай Дзевы Марыі Багародзіцы ўзброеных шляхцічаў і рэакцыі на тое ігумена.

У сцэне першага допыту аўтар асьвятліў некалькі момантаў: супрацоўніцтва Афанасія з казакамі і яго публічныя выступы супраць Уніі, абшуканьне жытла ігумена, нарэшце, зьбіцьцё затрыманага.

Цэнтральнае месца ў аповесьці займае сцэна катаваньня і забойства героя. Яна ўключае наступныя топікі: указаньне дакладнага месца ўчыненьня злачынства – барок ля вёскі Гершановічы; характарыстыку формы катаваньня; раскрыцьцё спосабу забойства; асьвятленьне апошніх хвілінаў жыцьця.

Аўтар даволі сьпецыфічна афармляў пераход ад аднаго эпізоду да другога. Так, пераход ад уступу да гістарычнай даведкі-напаміну выкананы з дапамогай выказваньня: “Напрод теды… припоминаем тое”. Пераход да сцэны літургіі абазначаны часавай прывязкай: “А был на тот час день соботный, мяновите – першій іюля”. Таксама ў якасьці інструменту пераходу ад сцэны катаваньня і забойства да ўзнаўленьня стыхіі аўтар скарыстоўваў часавую формулу: “Той зась ночы…”.

Аўтар “Аповесьці…” выкарыстаў шырокі арсенал мастацкіх сродкаў для стварэньня вобразаў герояў. Ён імкнуўся да паўнаты і вычарпальнасьці. Ён зафіксаваў этапныя моманты ў лёсе Афанасія, назваў суб’ектыўныя і аб’ектыўныя фактары, якія вызначалі яго, указаў, хто і калі канкрэтна паўплываў на зьмену жыцьцёвых пуцявінаў героя. Так, паводле аўтарскіх зьвестак, высылка з Варшавы да Кіеву адбылася на падставе рашэньня манарха Уладыслава IV, а пераезд у Луцк прапанаваны епіскапам Пузынам, ініцыятарамі ўзьвядзеньня на пасаду ігумена Берасьцейскага манастыра выступілі сябры праваслаўнага брацтва, і менавіта іхнюю просьбу задаволіў луцкі епіскап Пузына, у дыяцэзіі якога знаходзіўся манастыр.

Невядомы майстар слова вельмі шмат увагі надаваў псіхалагічнаму стану героя, яго перажываньням. Так, у момант зьяўленьня на парозе храму шляхцічаў, героя ахоплівае страх, наступае момант здранцьвеньня. Празаік паказвае героя ў крытычных сітуацыях: у момант, калі раз’юшаныя шляхцічы чыняць самасуд, абражаюць і зьбіваюць яго, што надае “Аповесьці…” выразную экзістэнцыяльную афарбоўку.

Цалкам у барокавым стылі, у якім упершыню адзначаюцца экзістэнцыяльныя элементы, у “Аповесьці…” падрабязна абмалёўваецца закатаванае цела Афанасія, падаюцца дэталі пра кулявыя адтуліны ў галаве, счарнелыя ад калёнага металу месцы на целе, зьнявечаны ад стрэлу твар, выпалы язык, які зашчаміўся паміж зубоў…

Апрача галоўнага героя ў аповесьці створаны вельмі яркі вобраз Гайдука, якому загадана выканаць вырак – застрэліць сьвятара. Гайдук вагаецца, яго ахоплівае сполах, ён просіць прабачэньня і дабраславеньня ў ахвяры, а затым у адчаі страляе ў лоб і забівае Афанасія. Пазьней ён раскайваецца ва ўчыненым, распавядае пра свой грэх.

Выключную мастацкую ролю ў аповесьці адыгрываюць параўнаньні і дыялогі. Семантыка апошніх вельмі разнастайная, у іх гучаць ультыматумы, абвінавачаньні, апраўданьні, пагрозы, запалохваньні.

Пісьменьнік шырока карыстаецца рэмаркамі, уводзіць у тэкст яркія мастацкія дэталі. Яны, зазвычай, фіксуюць месца знаходжаньня прамоўцы, ягоныя жэсты, выяўляюць вонкавы стан: спакойны, узбуджаны,

незадаволены. Нярэдка падкрэсьліваюцца асаблівасьці голасу персанажаў: побач з нейтральнымі – “рекл”, “мовил” – падаюцца якасныя характарыстыкі: “мовил великим голосом”, “крикнули”, “выригнул свою злобу”.

У аповесьці зроблена адна з першых у беларускай літаратуры спробаў падаць пейзажны малюнак у зьвязку з асноўнымі падзеямі ў творы. Несправядлівая сьмерць героя выклікала гнеў прыроды, распачалася бура з маланкамі і громам...

# Аповесьць пра пакуты і сьмерць айца Афанасія Філіповіча

Што вачыма нашымі бачылі і што ад іншых асобаў маглі даведацца – пра пакуты і зыход з гэтага сьвету нябожчыка айца Афанасія, ігумена нашага, тое пішам і сьведчым. Ня пішам пра жыцьцё яго і справы, пра якія і самі ведаюць усе, а таксама творы нябожчыкавы апавядаюць дастаткова. Мы тут раскажам пра пакуты і сьмерць яго, каб маглі пра іх ведаць тыя, хто прагне ведаць сёньня або потым.

Таму, каб парадак у той справе нашай захавалі, найперш, пачнем ад таго часу, як слаўнай памяці найясьнейшы Уладыслаў Чацьвёрты, кароль польскі, выслаў быў нябожчыка айца ігумена з Варшавы да Кіеву, дзе ён жыў бязвыезна ажно да сьмерці сьвятой памяці спадара айца Пятра Магілы, мітрапаліта Кіеўскага.

Потым прыехаў яго міласьць айцец Пузына, епіскап луцкі, да Кіеву на пагрэб мітрапаліта і ўзяў яго з сабою да Луцку. Затым, за просьбай нашай і за просьбай сьвецкага брацтва, прыслаў да нас на ігуменства ў Берасьце, якое належала да ягонай дыяцэзіі.

Хтосьці нядобры ў тым часе забурыў вайну з казакамі. І паўстаў вялікі перасьлед і непатрэбная сусьпіцыя на бедную Русь ад іншаверных па ўсёй Кароне Польскай і Вялікім Княстве Літоўскім.

Нічога ж нябожчык, айцец ігумен, і не гаварыў кепскага супраць уніятаў. Сядзеў сабе ціха ў манастыры пад час той трывожлівы. Але раптам паны судовыя каптуровыя Берасьцейскага ваяводства, з ініцыятывы пана Шумскага, на той момант капітана гвардыі каралеўскай, прыслалі некалькі асобаў з ліку шляхты да манастыру нашага, каб узяць яго да замку.

А быў на той час дзень суботні, менавіта першы дзень ліпеня, і сам нябожчык адпраўляў літургію ў храме Нараджэньня Прачыстай Дзевы Багародзіцы ў другім сваім манастыры. Калі ўбачыў тую шляхту, якая па яго прыйшла, у царкве, пад час сьпяваньня “Іжэ херувім”, стоячы ля прастолу, дужа ўстрывожыўся. Ён нібы страціў прытомнасьць, скамянеў, доўга нічога не адпраўляў, хоць трэба было другі раз прасьпяваць песьню херувімскую. Потым адышоў і працягнуў, скончыўшы парадкам усю тую літургію. Па сканчэньні выслухаў шляхту, якая па яго прыйшла была. І адразу, з царквы, нікуды не заходзячы, узяў з сабой другога брата і накіраваўся да замку.

Там, калі паўстаў перад судовымі панамі, пачаў спачатку да іх ласкава прамаўляць, паказваючы ім вялікую павагу і шанаваньне. Як Павел сьвяты перад імператарам Агрыпаю быў шчасьлівы, што прамаўляе перад імі. Але

тыя паны судовыя перапынілі нябожчыка і, ня слухаючы далей, загадалі інстыгатару, памянёнаму пану Шумскаму, распачаць і праводзіць супраць яго справу аб дасыланьні нейкіх лістоў і пораху казакам.

Айцец ігумен на тое кажа:

– Міласьцівыя панове! Хлусьня і выдумкі, нібыта я лісты ці порах казакам дасылаў. Вы маеце паўсюль сваіх мытнікаў, пашліце да іх, няхай яны скажуць, калі і куды я правозіў порах. А што да лістоў, няхай мне нехта прывядзе доказ на карысьць таго, што я іх пасылаў.

Тады яны адразу накіравалі таго інстыгатара і іншых пры ім, каб яны ператрэсьлі нашыя абодва манастыры і пашукалі тых лістоў і пораху. А калі нічога там не знайшлі і ўжо назад вярталіся, вырыгнуў сваю злосьць інстыгатар, рыкнуўшы да гайдукоў сваіх:

– Гэй, бадай, вас пазабівала б! Не маглі падкінуць якога мяшэчка пораху, паведаміўшы, што тут у манахаў знайшлі!

Убачылі й самі судовыя паны, што няма аніякіх доказаў, а толькі пустыя словы, сапраўдная выдумка. І пакінулі яго ў спакоі.

Затым пра іншую справу пачалі распытваць, кажучы:

– Але ж ты Унію сьвятую ганіў і праклінаў.

Адказваючы на гэта, нябожчык айцец ігумен найперш перахрысьціўся, прамовіў да іх:

– Ці за гэтым, міласьцівыя панове, прасілі мяне да вас прыйсьці, што я ганіў і праклінаў Унію вашую? Што на сойме ў Варшаве перад каралём яго міласьцю, панам сваім найясьнейшым Уладыславам Чацьвёртым і сенатам яго прасьветлым мовіў і заўжды паўсюль гаварыў, тое ж і перад вамі цяпер кажу: праклятая гэтая Унія вашая, і ведайце пэўна, калі яе з панства свайго ня выкараніце і Праваслаўнай Усходняй царквы не супакоіце, дык зьведаеце над сабою гнеў Божы!.

Прамовіў гэтыя словы гучным голасам, каб і тыя, што воддаль стаялі, добра маглі чуць.

Адразу некаторыя з прысутных там, у адказ на ягоныя словы, крыкнулі:

– Сьцяць! Катаваць! На палю ўзьбіць гэткага схізматыка!.

І пачалі ўжо было яго адзін да другога штурхаць і тузаць. Але судовыя паны загадалі ўсім пакінуць залу. Перамовіўшыся між сабою, кажуць да айца ігумена:

– Заслугоўваеш таго, каб цябе зараз тут ганебная сьмерць спаткала, якой табе не мінуць. Але цяпер пастанавілі ўзяць цябе да вязьніцы, пакуль не атрымаем зьвестак з Варшавы.

Таго брата, які з ім быў, адпусьцілі. А яго да цэйгаўзы да вязьненьня ў тым жа замку Берасьцейскім аддалі году 1648 ад Нараджэньня Ісуса Хрыста, месяца ліпеня першага дня.

Затым, праз некалькі дзён, яшчэ і кайданы на ногі ўскласьці загадалі. І гэтак у вязьніцы сядзеў ажно да дня пятага месяца верасьня таго ж году. Седзячы там, нябожчык пасылаў некалькі разоў аднаго з нас, сваіх братоў, да судовых паноў, каб мы прасілі: зрабіць палёгку для яго, адну з тых рэчаў учыніць – або каб кайданы загадалі зьняць, або каб з цэйгаўзы выпусьцілі. Абяцаў у кайданах хадзіць, пакуль яны захочуць.

Рабіў ён гэта з тае прычыны, як нам сам паведаміў, каб давесьці да іхняга ведама і разуменьня – неабходнасьць адмены іх настырнасьці ў справе Уніі.

Казаў:

– Бо калі гэтак ласкава са мной паступяць, мяне з кайданоў або з турмы вызваляць – значыць і словы мае супраць Уніі выказаныя сьцерпяць і прымуць. А калі нават і такую малую рэч не дазволяць – пэўне ж і большай не дазволяць, бо за Унію моцна стаяць.

А затым і пра супакаеньне казаў:

– Ня можам паклапаціцца пра сябе, супакою пазбавіліся з-за Уніі і крыўдаў, нанесеных Царкве-Матцы нашай Праваслаўнай.

Калі ён пабачыў, што нічога яму ня хочуць дазваляць, сьмела пачаў гаварыць:

– Ня выйдзе з панства меч і вайна, пакуль канчаткова ня будзе зламаная шыя Уніі! Дасьць Бог, неўзабаве дабраславеньне заквітнее! Вось, вось заквітнее, а Унія хутка згіне!

І так часта паўтараў. Калі бачыў шляхту, да іх з цэйгаўзы праз вакно прамаўляў.

Прыйшоў аднаго разу да айца ігумена брат, які ў той справе да судовых хадзіў, і кажа яму:

– Не хацелі вас паны ані з кайданоў, ані з турмы выслабаніць, бо не могуць вайны з казакамі скончыць.

Неўзабаве прыйшла да яго і шляхта з тым братам паслухаць, што адкажа айцец ігумен.

А ён пры ўсіх і кажа:

– Ня спыніцца тая вайна, бо ня хочуць Уніі з панства свайго выкараняць.

Шляхта, пачуўшы ад яго гэтыя словы, выгукнула: “Вой, які схізматык!”. І адразу пайшла адтуль да суду.

Аднойчы, у прысутнасьці князёў і біскупаў, імёны якіх тут не называем [на полі заўвага: біскуп Луцкі – Гэмбіцкі; князь, канцлер – Радзівіл. – *Заўв. пер.*], загадалі судовыя паны прывесьці да сябе нябожчыка ў кайданах. І запытаў яго той біскуп, ці праклінаў ён Унію. І прызнаўся нябожчык у тым, кажучы:

– Так! Бо яна і ёсьць выклятая!

Біскуп, не жадаючы слухаць далей, вымавіў:

– Будзеш раніцай язык свой бачыць у руках ката!

І загадалі да вязьніцы адвесьці і пасадзіць.

У ноч з чацьвёртага на пятае верасьня таго ж году нябожчыка айца ігумена вызвалілі з вязьніцы, раскавалі з кайданоў і праводзілі да абозу.

Перад тым аднак, кажуць, езуіты, ведаючы пра ягоную будучую сьмерць, прыйшлі ўначы да вязьніцы і пачалі словамі і абяцаньнямі адводзіць яго ад веры праваслаўнай, а затым і вогненнымі пакутамі палохалі. Але нічога, за ласкай Божай, не дамагліся, самі назад адышлі, толькі паслалі свайго студэнта за ім, які працягваў угаворваць нябожчыка перадумаць і ня даць загубіць сябе. На іхнія прапановы ён сказаў перадаць ім:

– Няхай езуіты ведаюць: як ім міла ў раскошы гэтага сьвету жыць, так мне міла цяпер на сьмерць пайсьці.

Што рабілі з ім у абозе, розныя чуткі ходзяць між людзьмі. Калі яго тае ночы прывялі да абозу і хацелі перадаць пану ваяводзе берасьцейскаму [ваявода Масальскі. – *Заўв. пер.*], той не захацеў яго да сябе браць і так сказаў:

– Навошта яго да мяне прывялі? Трымаеце яго ў сваіх руках – і чыніце з ім, што хочаце.

Калі яго гэтак выдаў старэйшы, узялі яго да сябе тыя, хто даўно прагнуў

ягонай крыві. І вялі яго да барку, які недалёка быў ад абозу, чвэрць мілі ад сяла Гершановічы, з левага боку. Там перадусім пяклі яго агнём. Адзін гайдук, што стаяў наводдаль, чуў голас нябожчыка айца, які нешта грознае ў пакутах крычаў. Потым паклікалі таго гайдука і загадалі яму мушкет забіць дзьвюма кулямі. Там жа загадалі падрыхтаваць зямлю. Спыталі айца наперад, ці адмаўляецца ад сваіх словаў, датычных Уніі, на што ён ім адказаў:

– Што сказаў, тое сказаў. З тым і паміраю.

Загадалі таму гайдуку, каб у лоб яму стрэліў з мушкету. Гайдук, бачачы, што перад ім духоўны і добра яму знаёмы, папрасіў найперш даравання і дабраславення, а потым у лоб яму выстраліў і забіў.

Той гайдук усім людзям, годным веры, пра тое расказваў. А мы ад яго даведаліся і тут напісаць загадалі.

Тое дзіва, што расказваў гайдук. Нібыта нябожчык, прастрэлены дзьвюма кулямі ў лоб навылёт, абапёрся аб сасну, стаяў нейкі час у сваёй моцы, да таго часу, пакуль не загадалі саштурхнуць яго ў магілу. Але й там, кажа, яшчэ сам тварам уверх перавярнуўся, рукі на грудзях накрыж склаў і ногі выцягнуў. Потым яго знайшлі на тым месцы менавіта так ляжачага.

Тае ж начы, калі яго страцілі, вялікі страх напаў на нас і ўсіх месьцічаў. З тае прычыны, што ў пагодную ноч, калі не было бачна ніводнай хмары, паліла страшная бліскавіца па ўсім небе. Таксама загадалі паны ўсім цэхам і гайдукам сабрацца ды цэлую ноч на рынку напагатове стаяць. Якраз яны бачылі ўсе тыя жахі на небе і распавялі пра іх.

Прызначаная шляхта і жаўнеры тым часам выправадзілі нябожчыка, айца ігумена, з замку на Замухавечча і вышэйапісаным спосабам страцілі яго на месцы памянёным.

Ляжаў нябожчык няведама дзе, не пахаваны намі, ад пятага верасьня ажно да першага мая, восем месяцаў. Здагадваліся, што няма яго ўжо на сьвеце жывога, але ня ведалі, дзе ягонае цела. Нарэшце, хлопчык адзін гадкоў сямі-васьмі паказаў нам тое месца, дзе яно знаходзілася. Спачатку мы хацелі даведацца, ці ён гэта, або хто іншы. Бо намерваліся патаемна яго адтуль вывезьці, бо тая зямля, дзе ляжала цела, належала езуітам. Затым, дачакаўшыся начы, адкапалі яго, упэўніліся, што гэта сапраўды ён, і адразу ж на іншае месца перавезьлі. Побач з целам не знайшлі аніякіх рэчаў, апрача адной кашулі, і тое падранай.

Назаўтра, з дазволу яго міласьці пана Феліцыяна Тышкевіча, палкоўніка харугваў павятовых берасьцейскіх, праводзілі цела да свайго манастыра Нараджэньня Прачыстай Багародзіцы. Потым праз некалькі дзён у храме сьвятога айца нашага Сімяёна Стоўпніка, на правым крыласе, у склепіку пахавалі. Перад тым, пагрэб яго ў адпаведнасьці з парадкам царкоўным учынілі. І цяпер там ягонае цела, дабрадзействам Божым, без псаваньня захоўваецца.

На целе яго бачныя знакі пакутаў і сьмерці. Пад пахамі з абодвух бакоў голыя косьці, асобныя кавалкі цела ад агню дужа счарнелыя. У галаве тры адтуліны: дзьве блізу вуха з левага боку, вялікія, як бы куля мушкетная, а трэцяя – з правага боку, за вухам, нашмат большая, чымся першыя дзьве. Твар яго дарэшты счарнелы ад пораху і крыві. Язык з роту між зубоў крыху выйшаў і там прысох. Здагадваемся пра прычыны: мусіць, жывога яшчэ закапалі, і ў вялікіх пакутах кананьня тое сталася.

Бог дабрадзействам сваім няхай умацуе і нас, дасьць трываласьць дзеля імя яго сьвятога!

Амінь!